# Краязнаўчыя сустрэчы з кіраўніцтвам ТБМ у Мсціславе і Заслаўі

25 студзеня ў Мсціслаўскім раённым доме культуры адбылася сустрэча , якую ладзілі мясцовы гістарычна-археалагічны музей і Таварыства беларускай мовы. Сабраліся настаўнікі і вучні мсціслаўскіх гімназій і школ, аматары краязнаўства. У сустрэчы браў удзел старшыня ТБМ Алег Трусаў, які распавёў пра гісторыю мсціслаўскага краязнаўства, пра Насовіча і яго слоўнік, пра Краснянскага, які з 1912 годзе выдаў гісторыю Мсціслава, пра Міхася Ткачова і яго кнігу "Замкі Беларусі", якая вытрымала ўжо пяць выданняў.

На сустрэчы выступіў дырэктар музея Ўладзімір Шылянкоў. Былі раздадзены календары з відамі Мсціслава, выпушчаныя ТБМ

3 лютага ТБМ разам з мясцовым музеем-запаведнікам наладзіла краязнаўчую сустрэчу ў Заслаўі. У сустрэчы на якую з Менска прыехалі старшыня ТБМ Алег Трусаў і першы намеснік старшыні Алена Анісім, прынялі ўдзел настаўнікі і вучні 2-й заслаўскай школы. Алег Трусаў распавёў пра каферу музеезнаўства ўніверсітэта культуры, а АленаАнісім пра рэспубліканскую краязнаўчую канферэнцыю 16 красавіка. Выступіў таксама дырэктар музея Аляксандр Рак і мясцовыя краязнаўцы.

Падчас сустрэчы прысутныя атрымалі календары з відамі Заслаўя, якім выдала Таварыства беларускай мовы.

***Наш кар.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ